# ЗАБЫТЫЯ ІМЁНЫ ЎНІВЕРСІТЭЦКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА РУХУ 1920-Х ГАДОЎ. ВАДЗІМ НЕВЯДОМСКІ

***А. У. Вайтовіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; vaitovich. aliaksandra@gmail.com*

У артыкуле адзначаецца актуальнасць біяграфічных падыходаў да вывучэння гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У цэнтры ўвагі аўтара – краявед В. І. Невядомскі, студэнт БДУ ў 1920-х гг. Мэтай артыкула з'яўляецца ўдакладненне фактаў яго біяграфіі і вызначэнне яго ўнёску ў культурніцкае жыццё ўніверсітэта. Высветлена, што В. Невядомскі на працягу 1928–1929 гг. займаў пасаду адказнага сакратара краязнаўчага таварыства. Ён прыкладаў вялікія намаганні да папулярызацыі краязнаўства. В. Невядомскага не заранулі рэпрэсіі канца 1920-х – 1930-х гг. У часы Вялікай Айчыннай вайны ён удзельнічаў у партызанскім руху.

***Ключавыя словы:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; краязнаўства; партызанскі рух.

# ЗАБЫТЫЕ ИМЕНА УНИВЕРСИТЕТСКОГО КРАЕВЕДЧЕСКОГО ДВИЖЕНИЯ 1920-Х ГОДОВ. ВАДИМ НЕВЯДОМСКИЙ

***А. В. Вайтович***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; vaitovich. aliaksandra@gmail.com*

В статье отмечается актуальность биографических подходов к изучению истории Белорусского государственного университета. В центре внимания автора – В. И. Невядомский, студент БГУ 1920-х годов. Цель статьи – уточнить факты биографии краеведа и определить его вклад в культурную жизнь университета. Установлено, что в 1928–1929 гг. В. Невядомский занимал должность ответственного секретаря краеведческого общества. Он приложил большие усилия для популяризации местной истории. Репрессии конца 1920-х–1930-х годов не затронули В. Невядомского. В годы Великой Отечественной войны он участвовал в партизанском движении.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; краеведение; партизанское движение.

# FORGOTTEN NAMES OF THE UNIVERSITY LOCAL HISTORY MOVEMENT OF THE 1920S. VADZIM NEVYADOMSKY

***A. U. Vaitovich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus; vaitovich. aliaksandra@gmail.com*

The article notes the relevance of biographical approaches to the study of the history of the Belarusian State University. The author focuses on local historian Vadim Nevyadomsky who studied at the BSU in the 1920s. The purpose of the article is to clarify the facts of his biography and to determine his contribution to the cultural life of the university. It is established that V. Nevyadomsky served as executive secretary of the BSU local history society in 1928–1929. He made great efforts to popularize local history. The repressions of the late 1920s –

early 1930s did not affect V. Nevyadomsky. During the Great Patriotic War, he participated in the partisan movement.

***Keywords:*** Belarusian State University; local history; partisan movement.

Пачатак XXI ст. стаў перыядам уздыму цікавасці даследчыкаў да гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Найбольш запатрабаванымі аказаліся падыходы, арыентаваныя на антрапалагічнае разуменне гісторыі і біяграфіку. Так, з нагоды стагоддзя БДУ быў апублікаваны пяцітомнік «Інтэлектуальная эліта Беларусі», які даў яскравы прыклад асэнсавання мінулага і сучаснасці ўніверсітэта скрозь прызму лёсаў выбітных выкладчыкаў і навукоўцаў [5]. Разам з тым, напісанне паўнавартаснай гісторыі БДУ патрабуе падрабязнага разгляду яшчэ аднаго неад'емнага складніка ўніверсітэцкай карпарацыі – студэнцтва. Дэталёвага вывучэння заслугоўвае не толькі пытанне аб ролі БДУ ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў, але і пытанне аб дзейнасці студэнцкай моладзі ў сценах альма-матэр.

Вялікую ўвагу адмыслоўцаў традыцыйна прыцягвае кароткачасовая, але плённая праца ўніверсітэцкіх краязнаўцаў 1920-х гг. Намаганнямі некалькіх пакаленняў аўтараў назапашны прадстаўнічы корпус літаратуры, які падсумоўвае дасягненні сяброў Навукова-даследчага студэнцкага краязнаўчага таварыства БДУ. Падрабязна апісаныя жыццёвыя і творчыя шляхі студэнтаў, што стаялі ля вытокаў універсітэцкага краязнаўчага руху: М. М. Улашчыка, С. С. Шутава, А. Д. Кавалені, А. Г. Аніхоўскага [4]). Дагэтуль, аднак, малавядомымі застаюцца старонкі жыцця і дзейнасці малодшай «змены», прадстаўнікі якой былі актыўнымі ўдзельнікамі краязнаўчай справы БДУ ў 1928–1929 гг. Адным з найбольш апантаных энтузіястаў у апошні перыяд функцыянавання таварыства быў Вадзім Іосіфавіч Невядомскі (мал. 1). Мэтай прапанаванага артыкула з'яўляецца ўдакладненне фактаў біяграфіі краязнаўца і вызначэнне яго ўнёску ў культурніцкае жыццё БДУ канца 1920-х гг.

Вадзім Невядомскі нарадзіўся ў 1906 г. на Брэстчыне ў настаўніцкай сям'і. Праз некаторы час бацькі пераехалі ў мястэчка Юравічы Рэчыцкага павету. Юнак, з дзяцінства імкнучыся да ведаў, скончыў Мазырскую сямігадовую працоўную школу, агульнаадукацыйныя курсы ў Мінску і ў 1925 г. стаў студэнтам БДУ. Першапачаткова ён планаваў стаць медыкам, але быў прыняты на педагагічны факультэт [9, арк. 2, 11, 13].

Вучоба ва ўніверсітэце не толькі адкрывала перспектывы набыцця грунтоўнай адукацыі, але і давала магчымасці паспрабаваць свае сілы ў рэалізацыі рознапланавых грамадскіх і асветніцкіх праектаў. В. І.

Невядомскі зацікавіўся дзейнасцю адной з найбольш вядомых універсітэцкіх арганізацый – Навукова-даследчага студэнцкага краязнаўчага таварыства.



Мал. 1. Вадзім Іосіфавіч Невядомскі – студэнт БДУ [9, арк. 1]

Варта нагадаць, што першыя гурткі краязнаўчага характару ўзніклі ў БДУ ў 1922 г. Яны не здолелі разгарнуць належную працу. Новую спробу стварэння краязнаўчага згуртавання зрабілі у снежні 1924 г. М. М. Улашчык, С. С. Шутаў, А. Д. Каваленя і інш. Гэтая ініцыятыва аказалася больш паспяховай. Універсітэцкія энтузіясты зладзілі шэраг экспедыцый па вывучэнні гісторыі і культуры Беларусі. На працягу 1926–1927 гг. гурток быў рэарганізаваны ў таварыства, у склад якога ўвайшлі як студэнты, так і супрацоўнікі БДУ. Праўленне ўзначаліў рэктар У. І. Пічэта. Найбольшым дасягненнем дзейнасці таварыства стала праведзенне летам 1927 г. комплекснай экспедыцыі ў Тураўскім раёне [1, с. 7; 2; 7].

У 1927/1928 вучэбным годзе краязнаўцы-старшакурснікі завяршалі навучанне ва ўніверсітэце і паступова адыходзілі ад спраў. М. М. Улашчык у сваіх мемуарах адзначаў: «Сэкцыі Таварыства працавалі даволі рэгулярна. Складалася ўжо нейкая традыцыя ў рабоце. Вырас корань. Людзі мелі больш кваліфікацыі. Больш-менш ведалі, што рабіць» [16, с. 89]. У той жа час гісторык даволі скептычна ставіўся да сваіх наступнікаў: «Зьмена, якая вучылася на малодшых курсах, хоць і прымала ўдзел у рабоце, але ня ўкладала ў гэта свае душы і ў дадатак не высунула нікога, хто б быў

арганізатарам ці, яшчэ прасьцей, адміністратарам» [16, с. 89]. Можна, аднак, сцвярджаць, што гэтыя заўвагі ўтрымлівалі празмерную крытыку.

У кастрычніку 1927 г. адбыўся чарговы агульны сход таварыства. Ключавым пытаннем, вынесеным на парадак дня, было абнаўленне кіруючага складу арганізацыі. На сходзе выбралі новых сяброў Праўлення. Адказным сакратаром (фармальна трэцяй асобай пасля старшыні У. І. Пічэты і намесніка старшыні Я. Н. Марука) стаў В. І. Невядомскі [2, с. 81–82; 7, с. 10]. Пры непасрэдным удзеле В. І. Невядомскага быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, якія атрымалі даволі значны розглас.

Вясной 1928 г. таварыства сумесна з Цэнтральным Бюро краязнаўства арганізавала шасцітыднёвыя «курсы-студыю» па краязнаўству. Курсы былі прыначаны як для студэнтаў БДУ, так і для слухачоў і выкладчыкаў іншых навучальных устаноў. Праграма курсаў уключала гісторыю і методыку краязнаўства, пытанні арганізацыі краязнаўчай справы, асновы музейнага будаўніцтва, праблемы вывучэння археалогіі, прынцыпы складання бібліяграфіі і інш. У склад лектараў уваходзілі прафесары БДУ, прадстаўнікі Цэнтральнага Бюро краязнаўства, Беларускага дзяржаўнага музея, Беларускага аддзела Беларускай бібліятэкі. Курсы праслухалі 300 чалавек [11; 7]).

Летам 1928 г. таварыства зладзіла тры вялікія экспедыцыі. Першая экспедыцыя накіравалася ў Вушацкі раён Полацкай акругі. Другая група студэнтаў і выкладчыкаў займалася вызначэннем ступені забруджанасці ракі Свіслач. Трэці атрад вывучаў сацыяльна-эканамічнае становішча падшэфнага БДУ Падгайскага сельскага савета [2; 7]. В. І. Невядомскі прыняў удзел у працы першай экспедыцыі. Універсітэцкія краязнаўцы даследавалі азёры паўночнай Беларусі, сабралі каля палутара тысяч лістоў гербарыя, абследавалі старыя шляхі зносін і старажытныя могільнікі, запісалі некаль соцень твораў вуснай народнай творчасці і інш. [7]). Згаданыя мерапрыемствы неаднаразова прыцягвалі ўвагу даследчыкаў [4]), у сувязі з чым падрабязнае апісанне іх ходу і вынікаў не ўяўляецца мэтазгодным. Варта звярнуць ўвагу на ўнёсак, зроблены ў агульную справу В. І. Невядомскім.

Па-першае, ён старанна выконваў свае адміністрацыйныя абавязкі. У асабістым фондзе М. М. Улашчыка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАНБ) захавалася пасведчанне аб удзеле ў экспедыцыі па абследаванні Полацкай акругі, выдадзенае студэнту І. І. Бараноўскаму. На дакуменце бачныя подпісы

намесніка старшыні таварыства Я. Н. Марука і сакратара В. І. Невядомскага (мал. 2).


ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ.-

Дадзена гэтае студ. Бел. Дзярж. Ун-ту, сябру Краязнаўчага Т-ва, тав. [illegible] у тым, што ён едзе на летнія вакацыі ў Полацкую акругу, дзе будзе праводзіць краязнаўчую працу, што і сьведчыцца.-

1928

СТАРШЫНЯ Т-ВА

САКРАТАР

Мал. 2. Пасведчанне ўдзельніка краязнаўчай экспедыцыі
па вывучэнні Полацкай акругі. 1928 г. Копія. [17, арк. 1]

Па-другое, юнак імкнуўся данесці інфармацыю аб дзейнасці ўніверсітэцкіх краязнаўцаў да шырокай грамадскасці. На працягу 1928 – першай паловы 1929 гг. з-пад яго пяра выйшлі шэсць рэпартажаў і аглядных артыкулаў, якія былі апублікаваныя ў газеце «Савецкая Беларусь» і часопісе «Наш край» [1–3, 10–13].

Праз некалькі месяцаў жыццё многіх рупліўцаў беларушчыны кардынальна змяніцца. У канцы 1928 – пачатку 1929 гг., аднак, кірункі развіцця краязнаўчага руху, зададзеныя ў папярэдні час, яшчэ выглядалі перспектыўнымі. Зімой 1928/1929 вучэбнага года быў праведзены шэраг сходаў сяброў таварыства. Пратаколы некалькіх пасяджэнняў захаваліся ў фондзе 205 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) [8]. Азнямленне з дакументамі дазваляе сцвярджаць, што адным з найбольш актыўных удзельнікаў мерапрыемстваў быў В. І. Невядомскі.

Так, 2 снежня адбылося пасяджэнне пашыранага пленуму Праўлення Навукова-даследчага студэнцкага краязнаўчага таварыства. Абмяркоўваліся пытанні асабістага складу арганізацыі. На пасаду старшыні таварыства быў пераабраны У. І. Пічэта, адказным сакратом застаўся В. І. Невядомскі [8, арк. 1]. Праз два тыдні адбыўся новы сход Праўлення. Універсітэцкія краязнаўцы падводзілі вынікі дзейнасці таварыства ў 1927/1928 годзе і абмяркоўвалі задачы, якія мусілі вырашацца ў наступныя месяцы. Пытанне аб планах працы стаяла на парадку дня і падчас

пасяджэнняў у студзені 1929 г. В. І. Невядомскі выступіў з дакладам аб цяжкасцях, з якімі сутыкаліся сябры таварыства. Ён сцвярджаў: «… канцэнтрацыя матар'ялаў ва ўмовах БДУ абавязкова выклікае арганізацыю краязнаўчага музэю, паставіўшы перад Праўленьнем БДУ пытаньне аб адвядзеньні сталага пакою для музэю. У аснову музэю неабходна пакласьці ўвесь матар'ял, сабраны экспедыцыямі і асобнымі членамі БДУ» [8, арк. 5–5звар.]. Праблема адсутнасці памяшкання для музея, сапраўды, была актуальная. На пасяджэнні абмяркоўваліся і іншыя цяжкасці, перадусім недахоп фінансавання [8, арк. 6].

Наступнае пасяджэнне сяброў таварыства адбылося 22 лютага 1929 г. На парадак дня было вынесена вызначэнне накірункаў працы секцый, а таксама абмеркаванне будучых публічных мерапрыемстваў. Універсітэцкія актывісты вырашылі працягваць адукацыйную дзейнасць і паўторна правесці краязнаўчыя курсы для усіх ахвотных. В. І. Невядомскі агучыў прапанову арганізаваць пры таварыстве бібліятэку. Знайшоў ён і спосаб папоўніць бюджэт краязнаўчага згуртавання: правесці платны дыспут. Абедзьве ідэі былі ўхвалены ўдзельнікамі сустрэчы [8, арк. 8–9]. Арганізацыйныя справы па рэалізацыі гэтых праектаў даручылі В. І. Невядомскаму (звесткі аб выкананні задуманага не былі знойдзены).

Апошняе пасяджэнне таварыства, пратакол якога быў выяўлены ў НАРБ, прайшло 7 сакавіка 1929 г. Універсітэцкія краязнаўцы абмеркавалі два маштабныя мерапрыемствы. Па-першае, была ўзгоднена праграма краязнаўчых курсаў, прызначаных для мінскіх студэнтаў, школьнікаў, настаўнікаў. Курсы, як і ў папярэднім годзе, праводзіліся ў супрацоўніцтве з Цэнтральным Бюро краязнаўства. Разам з тым, яны набылі большы размах: былі разлічаны на 400 чалавек і мусілі працягвацца восем тыдняў. У якасці лектараў былі запрошаны вядучыя навукоўцы і дасведчаныя краязнаўцы Беларусі [8, арк. 10–11 звар. ]. Інфармаваннем грамадскасці аб мерапрыемстве займаўся В. І. Невядомскі [3]. Па-другое, на сакавіцкім пасяджэнні было вырашана правесці вечар яўрэйскай літаратуры і этнаграфіі [8, арк. 10]. Вечар прайшоў у красавіку 1929 г. і стаў важнай культурнай падзеяй. Кароткая справаздача аб сустрэчы была змешчана ў часопісе «Наш край» [6, с. 65].

Вечарына стала апошнім мерапрыемствам, праведзеным універсітэцкімі краязнаўцамі. У другой палове 1929 г. пачаў раскручвацца махавік барацьбы з «нацдэмаўшчынай», які не абмінуў ні старшыню, ні многіх шэраговых сяброў краязнаўчага таварыства БДУ. Вадзім Іосіфавіч, аднак, пазбегнуў рэпрэсій. Ён паспяхова скончыў універсітэт і пачаў

паступова прасоўвацца па службовай і партыйнай лесвіцы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны В. І. Невядомскі знаходзіўся ў распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху. На працягу некалькіх месяцаў, з красавіка па лістапад 1942 г., ён ваяваў у партызанскім атрадзе «Хуткі» брыгады К. С. Заслонава. У 1943 г. быў узнагароджаны Ордэнам Чырвонай Зоркі [14; 15]. Далейшы лёс выпускніка педагагічнага факультэта БДУ, партызана В. І. Невядомскага патрабуе асобнага вывучэння.

Такім чынам, маладосць В. І. Невядомскага прыйшлася на супярэчлівыя 1920-я гг. На хвалі нацыянальнага ўздыму юнак далучыўся да дзейнасці ўніверсітэцкага Навукова-даследчага студэнцкага краязнаўчага таварыства. Фактычна, ён стаў галоўным летапісцам апошніх гадоў працы арганізацыі. Імя В. І. Нявядомскага павінна быць вернута з небыцця і мусіць заняць належнае месца ў гісторыі нашай alma mater.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Аніхоўскі А., Улашчык М. Краязнаўчая праца студэнтаў БДУ // Савецкая Беларусь. 1926. 14 студз.
2. Аніхоўскі Ал., Невядомскі В. Праца Таварыства Краязнаўства пры Беларускім Дзяржаўным універсытэце ў 1927–28 годзе // Наш край. 1928. № 8–9. С. 79–86.
3. Вадзім краявед. Падрыхтуем краяведаў // Звязда. 1929. 24 лютага.
4. Вайтовіч А. У. «Краязнаўчае ўра»: дзейнасць Краязнаўчага таварыства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта паводле матэрыялаў газеты «Савецкая Беларусь» // Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой радзімы : зборнік матэрыялаў. У 2 т. Т. 1. Мінск: Чатыры чвэрці, 2020. С. 80–85.
5. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусскай науки и высшего образования. Кн. 1–5. Мінск: БГУ, 2017–2021.
6. Ікс. Яўрэйскі этнографічны вечар у Менску // Наш край. 1929. № 4. С. 65.
7. Марук Я. Краязнаўчая праца студэнцтва // Наш край. 1929. № 1. С. 6–14.
8. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 330.
9. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 5765.
10. Н-скі Вад. Дзейнасьць Навукова-дасьледчага Т-ва Краязнаўства Бел. Дзярж. Ун-ту ў бягучым 28–29 г. // Наш край. 1929. № 3. С. 56–58.
11. Невядомскі В. 300 краязнаўцаў // Савецкая Беларусь. 1928. 9 мая.
12. Невядомскі В. Краязнаўчая праца ўлетку // Савецкая Беларусь. 1928. 9 чэрвеня.
13. Невядомскі В. На поўначы Беларусі (Краязнаўчая экспедыцыя студэнтцва на Полаччыне) // Савецкая Беларусь. 1928. 29 ліст.
14. Память народа [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://pamyat-naroda.ru/. Дата доступу: 23.08.2023.
15. Партизаны Беларуси [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://partizany.by/partisans/24191/. Дата доступу: 23. 08. 2023.
16. Улашчык М. М. Краязнаўства: Нататкі пра бадзянні ў 1924–1929 г.: З рукапіснай спадчыны. Мінск: БелНДІДАС–Пейто, 1999.
17. ЦНБ НАНБ. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 44 «М. М. Улашчык». Воп. 1. Спр. 1693.